# ТРЭБА З ЛЮДЗЬМІ РАЗМАЎЛЯЦЬ,

## але не абяцаць нічога лішняга і не падманваць

**Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка сустрэўся са Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімірам Андрэйчанкам, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Падчас сустрэчы Прэзідэнт праінфармаваны аб выніках сёмай сесіі Палаты прадстаўнікоў, выніках яе міжнароднай дзейнасці, планах на найбліжэйшы час. Прэзідэнт ацаніў дзейнасць беларускага парламента як «спакойную, ціхую, без гвалту, без крыку працу, на стварэнне».**

На сёмай сесіі дэпутатамі было прынята рашэнне аб прызначэнні даты прэзідэнцкіх выбараў, дадзены старт выбарчай кампаніі. У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы заклікаў дэпутатаў у час выбарчай кампаніі актывізаваць работу ў акругах, у тым ліку ў частцы ўзаемадзеяння з мясцовай уладай па вырашэнні праблем жыццезабеспячэння насельніцтва. Парламентарыям неабходна падключыцца да прэзідэнцкіх выбараў «у плане таго, каб данесці да людзей і растлумачыць ім найбольш складаныя моманты гэтай сітуацыі ў краіне і маючай адбыцца кампаніі». Кіраўнік дзяржавы выказаў перакананасць, што падчас выбараў неабходна пазбягаць папулізму, не абяцаючы людзям нічога лішняга, не падманваючы іх.

Аляксандр Лукашэнка выказаў думку, што ў гэты перыяд будзе нямала «розных выпадаў у адрас дзяржавы, у тым ліку і нашага грамадства». «Дэпутаты — людзі дасведчаныя, гэта палітычна актыўныя людзі; неабходна, каб яны растлумачвалі сваім выбаршчыкам тыя ці іншыя складаныя моманты або прапановы нашых апанентаў», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

«У прэзідэнцкія выбары ўсе вельмі шмат абяцаюць, але выконваць давядзецца таму, хто будзе выбраны, — прадоўжыў ён. — Я ўпэўнены, што нават калі будзе выбраны іншы чалавек, працаваць будуць людзі, якія цяпер працуюць. Яны ж з неба не зваляцца — спецыялісты і дзяржслужачыя. Гэта вельмі складаны працэс — падрыхтаваць дзяржаўнага служачага, таго ж чыноўніка. Таму многія застануцца працаваць, нават калі прыйдзе да ўлады хтосьці іншы, і можа нават апазіцыйны».

Прэзідэнт падкрэсліў, што беларусы не з тых людзей, якіх можна падмануць перадвыбарнымі абяцаннямі. «Ужо тут, як у народзе кажуць, локшыну на вушы не навесіш, але, тым не менш, спрабаваць будуць. І дэпутат павінен быць тым чалавекам, які павінен зберагчы наша грамадства ад залішніх надзей на тое, што іх нехта азалоціць. У свеце час няпросты. І проста так нічога не робіцца, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Свет становіцца ўсё больш складаным, і нам у гэтым складаным свеце не так проста адаптавацца і прыстасавацца. Але гэта наша праблема — праблема ўлады, і мы адаптуемся. Дэпутаты павінны дапамагчы з растлумачэннямі тых ці іншых пазіцый нашаму насельніцтву».

«Дэпутат — гэта чалавек, які карыстаецца даверам насельніцтва, і трэба з людзьмі размаўляць. Не трэба ім нічога лішняга абяцаць і не трэба падманваць людзей. Мы гэтага павінны не дапусціць», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

# НАШ СЭРВІСНЫ ЦЭНТР У АФРЫЦЫ

**Стварыць такую магутную структуру па абслугоўванні беларускай тэхнікі прапанаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Аляксандр Лукашэнка па выніках сустрэчы з віцэ-прэзідэнтам Зімбабвэ Эмерсанам Мнангагва прапанаваў падрыхтаваць дарожную карту развіцця двухбаковых адносін, а таксама прапрацаваць пытанне стварэння магутнага сэрвіснага цэнтра па абслугоўванні тэхнікі — адзінага для беларускіх прадпрыемстваў.

Месцам размяшчэння такога цэнтра можа стаць Зімбабвэ, працаваць ён будзе на некалькі краін рэгіёна. Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы прапанаваў арганізаваць у Беларусі навучанне для спецыялістаў з Зімбабвэ, якія будуць працаваць на тэхніцы, што пастаўляецца туды.

# КАЛІ СКАРДЗІЦЦА СТАЛА ПРЫВЫЧКАЙ...

## З прафесійных скаржнікаў пачнуць спаганяць расходы за выезд на месца звароту

**Гэта прадугледжана законам «Аб унясенні змен і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб», які падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Канкрэтызавана сфера дзеяння закона «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб». Так, цяпер яго дзеянне не будзе распаўсюджвацца на звароты, якія вынікаюць з адносін паміж работнікам і наймальнікам.

Зменены падыходы да вылічэння тэрмінаў пры разглядзе зваротаў. У прыватнасці, ход тэрмінаў будзе пачынацца не з дня рэгістрацыі звароту, а з дня, наступнага за ім. Акрамя таго, пяцідзённы тэрмін, на працягу якога арганізацыі павінны прыняць рашэнне па паступіўшых да іх зваротах, што не адносяцца да іх кампетэнцыі, будзе вылічацца ў рабочых днях.

У дакуменце замацаваны правы арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія разглядаюць звароты, дапоўнены пералік падстаў для адмовы грамадзянам у асабістым прыёме. Так, да гэтых падстаў аднесены звароты ў неўстаноўленыя дні і гадзіны, а таксама па пытаннях, што не адносяцца да кампетэнцыі арганізацыі.

Акрамя таго, удакладнены парадак разгляду электронных зваротаў. Напрыклад, замацаваны абавязак прадстаўнікоў заяўнікаў прыкладаць копіі дакументаў, што пацвярджаюць іх паўнамоцтвы. Прадугледжана магчымасць спынення перапіскі з заяўнікамі, якія накіроўваюць паўторныя звароты ў адну і тую ж арганізацыю, да кампетэнцыі якой іх разгляд па сутнасці на адносіцца.

Закон удакладняе расходы, якія могуць быць спагнаны з заяўнікаў у выпадку сістэматычнага накіравання неабгрунтаваных скаргаў. Да іх аднесены сумы, што падлягаюць выплаце экспертам, паштовыя расходы і расходы, звязаныя з выездам на месца разгляду звароту.

# ПРАВА ЗБОРУ ПОДПІСАЎ

### ТЭНДЭНЦЫЯ ЗАХАВАЛАСЯ

Сакратар ЦВК заўважыў, што на працягу ўсёй гісторыі прэзідэнцкіх выбараў у нашай краіне захоўваецца адна і тая ж тэндэнцыя: прэтэндуе значна больш людзей, чым потым трапляе ў спісы кандыдатаў.

— На ўдзел у першых прэзідэнцкіх выбарах у 1994 годзе спярша прэтэндаваў 21 чалавек, а ў бюлетэнь трапілі шэсць. У 2001 годзе з 26 прэтэндэнтаў былі зарэгістраваны чатыры, а калі Сямён Домаш зняўся, засталося тры. У 2006 годзе стартавалі 14 чалавек, у бюлетэнь трапілі чатыры. У 2010 годзе з 17 заяўленых было зарэгістравана 10 ініцыятыўных груп, і ўсе яны сабралі не менш за 100 тысяч подпісаў, таму было зарэгістравана 10 кандыдатаў, — нагадаў журналістам сакратар ЦВК.

Падчас цяперашняй выбарчай кампаніі намер удзельнічаць мела большая колькасць прэтэндэнтаў, чым было разгледжана заяў аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп. Некаторыя дакументаў нават не падалі. Разам з тым пра зарэгістраваныя групы Мікалай Лазавік сказаў: «Думаю, у большасці з іх ёсць рэальныя шанцы сабраць неабходныя 100 тысяч подпісаў для рэгістрацыі кандыдатаў у прэзідэнты».

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Фота БЕЛТА.

### ЗБОР ПОДПІСАЎ — З 23 ЛІПЕНЯ

У аўторак, 21 ліпеня, ужо ўсе зарэгістраваныя ініцыятыўныя групы атрымаюць пасведчанні, але збіраць подпісы можна толькі з чацвярга — 23 ліпеня.

— Кожны грамадзянін, да якога будуць звяртацца зборшчыкі подпісаў, павінен ведаць, што ў членаў ініцыятыўнай групы ў абавязковым парадку павінна быць пасведчанне, выдадзенае Цэнтральнай выбарчай камісіяй, з пячаткай і подпісам старшыні камісіі. У верхняй частцы падпіснога ліста павінна быць пазначана, за каго збіраюцца подпісы. Нельга збіраць подпісы без гэтай умовы, — звяртае ўвагу Мікалай Лазавік. — Ведаю выпадак, калі збіралі подпісы быццам бы супраць будаўніцтва нейкага аб'екта, а насамрэч — за кандыдата ў дэпутаты парламента. Гэта недапушчальна. Акрамя таго, у падпісным лісце павінны быць указаны прозвішча, імя і імя па бацьку зборшчыка подпісаў.

Сакратар ЦВК таксама нагадаў, што звесткі пра грамадзяніна, які ставіць свой подпіс, могуць быць запоўненыя членамі ініцыятыўнай групы (рукапісным спосабам і не алоўкам), але дата і подпіс павінны быць напісаны рукой самога выбаршчыка.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
*medvedeva@zviazda.by*

■ Эканамікс

# ХОЛДЫНГІ ЁСЦЬ. КЛАСТАРЫ БУДУЦЬ?

## Плюсы і мінусы працы ў «звязцы»

**Бадай, чытачы, далёкія ад бізнесу і вялікай эканомікі, наўрад ці зацікавіліся б навіной пра тое, што ў Віцебску адбылося пасяджэнне Савета па развіцці прадпрымальніцтва. Маўляў, прыехалі дзелавыя людзі, за кавай пагутарылі «пра сваё». Але ж хай і абмяркоўваліся насамрэч «вузкія тэмы», яны, як той казаў, «на выхадзе» тычацца кожнага. Як, напрыклад, у ліку іншага можна зрабіць таннейшымі тавары? Ці «свецяць» працоўныя месцы з добрым заробкам? А як пачаткоўцам у бізнесе можна даволі хутка зарабіць вялікія грошы?**

Перад пасяджэннем члены Савета па развіцці прадпрымальніцтва наведалі прадпрыемствы, якія паспяхова працуюць, экспартуюць прадукцыю. У прыватнасці, «Вітбудтэхмаш», «Палімерканструкцыя», абутковы брэнд «Марка». Дарэчы, прыкладна кожная трэцяя пара абутку ў краіне вырабляецца на аднайменным холдынгу, у складзе якога 6 прадпрыемстваў. Беларуская гарбарна-абутковая кампанія «Марка» будуе лагістычны цэнтр. Ён будзе забяспечваць сыравінай усіх вытворцаў. Як вынік гэта можа паўплываць на зніжэнне сабекошту прадукцыі.

— Кожнае з гэтых прадпрыемстваў з'яўляецца добрым прыкладам для іншых. Яны працуюць паспяхова, дэманструюць, што сёння, у няпросты час, можна вырабляць якасную прадукцыю, запатрабаваную і ў іншых краінах. А гэта магчыма пры выкарыстанні сучасных тэхналогій, сістэмах кіравання вытворчасці, — сказаў **старшыня Савета па развіцці прадпрымальніцтва Пётр ПРАКАПОВІЧ.** Ён адзначыў, што трэба «падставіць плячо» ў магчымым стварэнні холдынгаў на базе першых двух са згаданых вышэй прадпрыемстваў. Каб, як «Марка», яны ядналі вытворцаў, стваралі новыя працоўныя месцы.

Падчас пасяджэння бурную дыскусію выклікала пытанне аб магчымасцях фарміравання і развіцця ў нашай краіне прамысловых кластараў.

— У кластары самастойныя юрыдычна фірмы і прадпрымальнікі ўзаемадзейнічаюць паміж сабой на дагаворнай аснове. У адрозненне ад звычайных партнёраў па бізнесе, яны працуюць у «звязцы» для стварэння нейкай прадукцыі і не толькі. Кластар дае магчымасць фірмам зменшыць выдаткі. Напрыклад, на маркетынгавае даследаванне, правядзенне карпаратыўных семінараў. Можна паскорыць вывучэнне дзелавога вопыту, — распавядае Дзмітрый Крупскі, начальнік упраўлення навукі і інавацыйнай палітыкі Міністэрства эканомікі.

Паводле яго слоў, ужо ёсць «першая ластаўка» — беларускі кластар, у які аб'яднана каля 70 арганізацый, фірмаў. Сярод іх тыя, што працуюць у сферы высокіх тэхналогій, а таксама навуковыя арганізацыі і ўстановы адукацыі. Яны выразна пазіцыянуюць свае агульныя інтарэсы...

— Цалкам ахоплены кластарызацыяй дацкая, фінская, нарвежская і шведская прамысловасці. У выніку Фінляндыя займае вядучыя месцы ў сусветных рэйтынгах канкурэнтаздольнасці, — працягвае прадстаўнік міністэрства.

У Фінляндыі меней за 1% сусветных лясных рэсурсаў, а яна забяспечвае 10% экспарту прадукцыі перапрацоўкі драўніны, 25% — паперы. У Кітаі існуюць каля 60 асаблівых зон-кластараў, на якіх працуюць каля 30 тысяч фірмаў. У штаце апошніх каля 3,5 мільёна чалавек. Узровень продажу прадукцыі — каля 200 мільярдаў долараў за год.

Удзельнікаў пасяджэння цікавілі магчымыя дзяржаўныя прэферэнцыі. У Францыі, Шатландыі кластарныя структуры атрымліваюць пазыкі, субсідыі. У Швецыі вылучаюць мэтавыя датацыі на навукова-даследчыя распрацоўкі. У Расіі таксама аказваецца падтрымка: выдаюць пазыкі, у тым ліку беспрацэнтныя і бязвыплатныя, зніжаюць тарыфы на камунальныя паслугі, страхуюць кантракты... У Беларусі пакуль прапрацоўваюцца магчымыя варыянты.

У кластараў ёсць і недахопы. Напрыклад, буйныя фірмы рызыкуюць «выгадаваць сабе канкурэнтаў». Але выгад больш, і адпаведна ўжо ёсць зацікаўленасць. Напрыклад, кіраўнік холдынга «Марка» Мікалай Мартынаў адзначыў, што ў Беларусі вырабляецца, мякка кажучы, недастатковая для айчынных вытворцаў колькасць падэшваў, аксесуараў для абутку. Таму купляюць за мяжой. А было б аналагічныя айчынныя прапановы, чаму б і не купляць якасную прадукцыю па разумнай цане? Дзяржаўную падтрымку вытворцы могуць атрымаць у рамках праграмы імпартазамяшчэння. А потым «Марка» і не толькі, магчыма, і «ўвойдуць» з самымі дастойнымі ў кластарныя адносіны.

Ці прыжывуцца апошнія, пакажа час. Тыя ж холдынгі, калі пачалі іх ствараць, выклікалі нямала скептыцызму. Але вопыт іх працы даказаў, што яны эфектыўныя. Днямі стала вядома пра рашэнне аб стварэнні холдынга па вырабе алкагольнай прадукцыі. Не выключаецца, што і беларускія кластары таксама пацвердзяць права на жыццё...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*